
Самапомач

Беларуская кооперацыйна-гаспадарчая часопісь

Год V.	Вільня, Кастрычнік 1936 г.	№ 10.


Хай злыдні над намі,
скрыгочуць зубамі
Любі сваю ніву, свой
край,
І, колькі ёсьць сілы,
да самай магілы
Ары, барануй,
засявай!.

ЯНКА КУПАЛА.



Усе вялікія падзеі народаў і ўсе цывілізацыі былі створаныя дабравольнымі стараньнямі аб'яднаных людзей... самапамаччу.

Джордж РЭССЭЛЬ
(Ірляндзец).



ЗЬМЕСТ № 10 (51).

Ceny ŭ Vilni

Zbožža. *26.X.36, za 100 kilohram.*

Žyta	17.75—18.75
Pšanica	23.00—25.00
Jačmień na pansak	20 50—21.50
Avios	15.75—17.25
Hračycha	20.00—21 00
Muka pšaničnaja	28.00—45.50
Muka žytniaja da 50%	29.00—29 50
„ „ da 65%	26 50—27 00
Muka razovaja da 95%	22 00—22.50
Votruby žytnija	12.75—13 25
„ pšaničnyja	14.00—14.50
Łubin sini	8.50— 9.00
Siemia lannoje b. 90%	36.00—37.00
Lon trapany, Vałožyna	1330.—1370.
Lon trapany, Miory	1300.—1340.
Lon trapany, Harodziej	1560.—1600.
Lon časany, Harodziej	1880.—1920.
Makuchi lannyja	—19.00
„ sonieśnikavyja	—20.00
„ z repicy	—16.00

Małočnaje za 1 kilo (14.X.36).

Masła najlepšaje, I. sort za kil. ŭ hur.	2.60—2.70
„ „ „ „ „ u detalu	—3.00
Masła stałovaje II sort za kilo ŭ hurcie	2.50—2.60
„ „ „ „ „ u detalu	—2.90
Syr litoŭski, za kilo ŭ hurcie	1.40—1.70
„ „ „ „ u detalu	1.60—2.20
Syr ementalski(švajc.)za kilo ŭ hurcie	2.40—2.50
„ „ „ „ „ u detalu	—3.00
Jajki, kapa	5 40—6.60
„ za štuku	10—13 hraš.

Miasnoje 6 X.36.

Za kilo žyvoj vahi:

Bydła:	stadniki	0.35—0,45
	karovy	0.29—0,39
	cialaty II sort	0.70—0.75
Švini:		0.65—0 80
Aviečki		0.48 - 0.53

Miasa:	vałovina, całyja štuki	0.60—0.70
	vałovina, zady	0,80—1.00
	vałovina, pierady (košar)	1 00—1.20
	cialacina	1.00—1.10
	švinina	1.10—1.20
	baranina	0.70—0.80
Skury syryja:	bydlačyja za 1 kilo	1.00—1.05
	cialačyja za št.	6.50—6.75
	aviečyja	4.50—4.75
	ščacina, niesart za kilo	7.00—8.00

Samapomač

BIEŁARUSKI KOOPERATYŪNA - HASPADARSKI ČASAPIS.

Adres: VILNIA (Wilno), Połackaja vul. 9—4.

Самапомач

Hod V.	Vilnia, Kastryčnik 1936 h.	Nr. 10 (51).

Kudy padzielisia „pionerskija prymiety"?

Kali 23 listapada 1934 h. dzieviać polskich Sajuzaŭ Ziemlarobskaj Kooperacyi padparadkavalisia pastanovie Kooperatyŭnaj Rady z dn. 31.X.1934 h., i złučylisia ŭ adzin varšaŭski „Związek Spółdzielni Rolniczych i Zarobkowo-Gospodarczych Rzplitej", tady my byli pamiž pieršymi, što heta prymusovaje „złučańnie" nazvali abmyłkovym. Minułyja dva hady ŭ pracy „złučanaj" polskaj kooperacyi nia raz i nia dva paćvierdzili našy pahlady. Nia možna adnak siahońnia prajšci moŭčki i nad adnym z apošnich dokazaŭ, zanotavanych u „Dz. Wil." № 290. Aŭtor artykułu p. n. „Biurokratyzacyja polskaj Kooperacyi" u pakazanym n-ry hazety miž inšym piša:

„...Naturalna, hetkaja centralizacyja musiła daviaści da vialikaj formalistyki, jakaja mścicca.

Kali šef personalnaha addziełu (tytuł nia važny) hetkaj vialikaj arhanizacyi ŭ Varšavie pry Vareckaj 11-a choča ŭsio viedać ab pracaŭniku (revidencie kooperatyvaŭ — *red.*) u Lvovie, Vilni ci Toruni, dyk kožny z ich pavinien vieści štodzienny žurnał, jaki byŭby lišni ŭ sajuzach mienšych, dzie Uprava stykałasia-b z pracaŭnikom štodzień, viedała-b što jon robić... Ab prydatnaści revidenta pavinien vyrašać toj, kamu Sajuz kooperatyvaŭ maje služyć. Sajuzy Kooperatyvaŭ sarhanizavany nie dziela prakuratarskaj revizyi, ani skarbovaj, ani buhalteryjnaj... — Kooperatyvy łučacca dziela ŭzajemnaj pomačy, dziela abmieńvańnia svaimi dośledami...

Dziaržaŭnaja administracyja maje tendencyju da decentralizacyi: što raz bolš pieralivajucca paŭnamoctvy na vajavodaŭ i na starastaŭ, a ŭ polskaj kooperacyi — idučy kamušci na ruku — zaviedziena dalokaja centralizacyja...

Najmienš niepatrebnaj raboty budzie tady, kali płatnyja pracaŭniki Patronatu ci Sajuzu Kooperatyvaŭ buduć vykłučna pad kantrolaj Upravy vybranaj u svaim vokruzie.

Tymčasam siahońnia jość jak-raz naadvarot. Hałoŭnym starańniem Sajuzu musić być, kab revident byŭ zaćvierdžany Uradam, staršynioj dziaržaŭnaj Kooperatyŭnaj Rady, katorym jość ministerski čynoŭnik"...

Usio heta jość naśledkam „novaha" zakonu ab kooperacyi, da jakoha, ŭśled za b. ministrami Kaźłoŭskim i Zavadzkim, „aviečym honam" hnalisia—na žal!—i mnohija polskija kooperatary. Sučasny ministar Kviatkoŭski na sioletniaj viaśnianaj (ad 28 lutaha da 2 sakavika) haspadarskaj naradzie, praŭda, zajaviŭ, što kooperacyi treba „**viarnuć daŭniejšyja prymiety pionerskija**", ale na hetym ministrava „dobraja vola" i skončyłasia. Zakon ab kooperatyvach z 13 sakavika 1934 dalej niepadzielna trymajecca ŭ sile. A tymčasam polskija kooperatary z svaimi patronami, apirajučysia na hety-ž zakon, robiać nastup na apošnija kooperatyŭnyja placoŭki, jakija paŭstali ŭ nas dziakujučy vykłučna kooperatyŭnaj śviedamaści biełaruskaha sialanstva. Hetyja biełaruskija kooperatyvy paŭstali zadoŭha pierad dniom 13.III.1934 h., ni hraša ni skul padmohi nie patrabavali i nie patrabujuć i da siahońnia vielmi dobra raźvivajucca. I adnak hetyja našyja kooperatyvy stanoviacca siahońnia pierad kanieśnaściu „złučacca" z kooperatyvami novymi, jakija dahetul navat nie pačali ŭ adpaviednaj branžy pracavać.

Ci-ž treba bolš jarkaha prykładu ab tym, jak daloka zakinieny siańnia polskimi kooperatarami „pionerskija prymiety"?

Być moža, što praz niejki čas, kali pierastanuć isnavać apošnija biełaruskija kooperatyvy, siahońniašnija — ci choć-by i novyja— pavadyry polskaj kooperacyi „apomniacca" i skažuć, što „treba viarnuć daŭniejšyja pionerskija prymiety": kamu i našto tady hetyja „prymiety" buduć u nas patrebnyja?

U siańniašnim kooperatyŭnym žyćci Polščy dźvie rečy jość peŭnyja: kiepska pryślužylisia kooperacyi inicyjatary zakonu z 13.III.1934; horš adnak robiać tyja, što z stvoranaha zamiašańnia s a m a l u b n a karystajuć i choć razumiejuć kanieśnaść napravy, to adnak jaje ŭstrymlivajuć.

Jak štohod, tak i sioleta 31 kastryčnika pa ŭsim kulturnym śviecie budzie śviatkavacca D z i e ń A š č a d n a ś c i.

Kožny biełarus pavinien u hety dzień adnavić pastanovu aščadžać: č a s, z d a r o ŭ j e i h r o š y.

Kooperatyŭnyja naviny.

Narady Mižnarodnaha Kooperatyŭnaha Sajuzu. Ad 21 da 26 vieraśnia siol. ŭ Varšavie adbyvałasia pasiedžańnie Mižnarodnaha Kooperatyŭnaha Sajuzu (MKS). Heta pasiedžańnie Sajuzu mieła vyrašyć dźvie hałoŭnyja spravy: zaniać stanovišča da apošnich padziejaŭ u Saviecka j kooperacyi, jakaja jošć siabram MKS, i sprava pomačy kooperacyi hišpanskaj. Pieršaja sprava niavyrašana z pryčyny niajaŭki na pasiedžańnie pradstaŭnikoŭ saviecka j kooperacyi. U spravie druhoj było pastanoŭlena sarhanizavać pomač „pa abieich staronach barykady".

Pry akazii treba skazać, što MKS heta centralnaja mižnarodnaja arhanizacyja kooperatyvaŭ. Zasnavany hety Sajuz byŭ u 1895 h. i pavodle statutu svajho maje: *„imknucca zusim niezaležna i pry pomačy sobskich srodkaŭ da zamieny sučasnaha ładu konkurencyi pryvatnych pradpryjemstvaŭ na ład kooperatyŭny, sarhanizavany dziela zaspakajeńnia intaresaŭ ahułu hramadzianstva i abapiorty na ŭzajemnaj samapomačy".*

Sajuz hrupuje ŭ sabie siańnia kala 150 kooperatyŭnych centralaŭ u 40 krajoch. Staršynioj Sajuzu jošć ciapier finlandziec V. Tanner, a sekretarom—anhličanin H J. May. Najvyšejšaj uładaj Sajuzu jošć Kanhres, jaki adbyvajecca što try hady. Kanhres vybiraje Centralny Kamitet z 60 asob, a hety apošni vybiraje Kamitet Vykanaŭčy z 11 asob. Centralny Kamitet źbirajecca najmienš raz u hod, što raz u inšych miascoch śvietu i hetkaje pasiedžańnie Centr. K-tu MKS sioleta pieršy raz adbyłosia ŭ Varšavie. Naleta pasiedžańnie Centr. K-tu naznačana ŭ Paryžy. Stały adres M.K.S. hetki: „International Co-operative Alliance, „Orchard House", 14, Great Smith Street, Westminster, London S. W. 1.

Źmiena staršyni Kooperatyŭnaj Rady. Dahetulašni staršynia Kooperatyŭnaj Rady K. Pomijalski zvolnieny z svajho stanovišča i na jaho miesca naznačany St. Sadkoŭski. Ab tym, kab z hetaj pieramienaj źmianicca mieła i palityka samoj Rady ŭ adnošańni da kooperacyi, tymčasam ničoha nia čuvać. A hetaha vielmi treba.

Važnaje dla kooperatyvaŭ niesajuznych u Polščy. Kooperatyŭnaja Rada pry Ministerstvie Skarbu ŭ Varšavie, da katoraj, pavodle zakonu, naležać usie kooperatyvy nienaležučyja da nijakaha revizyjnaha Sajuzu, nakazvaje ŭsim hetkim kooperatyvam, kali jany farmalna sudom nia likvidavany, prysyłać u Radu pa 2 ekz. kopijaŭ: c) spravazdačy za 1935 h., razam z rachunkovym zamknieńniem za hety-ž hod i b) pratakołu Ahulnaha Schodu, jaki zaćvierdziŭ bilans kooperatyvy. Za niaprysłańnie ŭ čas hetkich spravazdačaŭ Kooperatyŭnaja Rada pahražaje, što budzie abkładać štrafam siabroŭ upravy kooperatyvy.

Kuplajuć dla vojska samaloty. Hazety padajuć, što „Związek Spółdzielni Rolniczych i ZarobkovoGospodarczych" užo sabraŭ ad svaich kooperatyvaŭ 48.000 (sorak vosiem tysiač) zł., na dva samaloty dla vojska.—Chutka chiba pačujem, što pradstaŭniki hetaha samaha Sajuzu pojduć prasić ad Uradu zapamohaŭ na mety kooperatyŭnyja: ci heta kooperatyŭnaje „vychavańnie"?

Reformy i plany „Społem'u". Polski Sajuz Spažyv. Kooperatyvaŭ „Społem!" pravodzić apošnim časam decentralizacyju, h. zn. pieradaje z centrali niekatoryja spravy da vyrašeńnia ŭ Akruhoch. Miž inšym ciapier na Akružnych źjezdach vybirajucca kandydaty ŭ centralnyja ŭłady Sajuzu. Akružnyja źjezdy vybirajuć Akružnyja Rady, jakija kirujuć u vokruzie arhanizacyjnaj rabotaj i kantralujuć rabotu revidentaŭ Centralnaha Sajuzu. — Na siolet-

M. Rapacki: (3)

Haspadarčaja prahrama spažyvieckaj kooperacyi.

(*Kančatak*).

Pierachodžu da apošniaj častki maich tezaŭ... Prypaminaju toje, ab čym kazaŭ spačatku. Kali majem dosyć pracoŭnych ruk, syrca i varstataŭ pradukcyi, dyk što nam pieraškadžaje zrabić hetulki praduktaŭ, kolki patrabujem Zabudźmasia ab tym, što isnujuć hrošy. Pradstaŭma sabie, što ŭsie ludzi pracujuć biaspłatna, ale biaspłatna atrymoŭvujuć i pradukty. Pry hetych troch varunkach, kali majem dosyć pracoŭnych ruk, dosyć syrca i varstataŭ pradukcyi, — zaspakojvali-b my našy patreby, až pakul adnaho z hetych čyńnikaŭ niechapiła-b. Na razie ich jošć dosyć. Dyk čamu nam hrošy mieli-b pieraškadžać? Treba tolki naležna pravieści rearhanizacyju hrošaŭ. Bo-ž heta budzie samaapłačalnaje, kali patrapim padniać hramadzki dachod.

Z praktyki viedajem, što kab niekatory hatunak pompaŭ puścić u ruch, dyk treba nalić vady, a tady pompa ŭžo pracuje sama. Taksama i z žyćciom haspadarčym. Treba zaličkavać, treba naŭpierad dać peŭnuju čašć hramadzkaha dachodu. Heta zaličkavańnie mahło-b vyhladać u formie vypuščeńnia adpaviednaha liku banknotaŭ, abo dziaržava sama padvyšyła-b płatu i zmusiła-b usich pradpryjemcaŭ taksama padniać płaty, dajučy im na patrebny čas adpaviednaje dyskonto ŭ Banku Polskim. Heta było-b roŭnaznačnym z uviadzieńniem inflacyi banknotaŭ. U sučasnych varunkach ja byŭ-by hetamu praciŭny, bo heta musiła-b davieści da devaluacyi...

Dziela hetaha časova treba było-b zavieści valutu pamacničuju, jakuju vypuściła-b specyjalnaja instytucyja (bank) pad nadzoram dziaržavy. Byli-b heta h. zv. tavarnyja bony. Nia mieli b jany charaktaru prymusovaha srodku płatni ŭva ŭsich vypadkach. Možna było-b

Сельская гаспадарка.

Як далей быць?

На наш артыкул **„Больш асьветы.“** — *з нагоды 50 га нумару „Самапомачы“*, які быў падхоплены і перадрукаваны іншымі газэтамі, мы атрымалі шмат пісьмаў, аўторы каторых выказваюць жывое зацікаўленьне дальшым лёсам часапісу і даюць свае рады, як справу вырашыць. Гэта зацікаўленьне шырокіх кругоў нашага грамадзянства забавязвае нас да дальшага шуканьня выхаду ў назначаным ужо кірунку, гэта знача ў кірунку расшырэньня часапісу што да абыйма і што да частасьці выхаду. Робім гэта ахвотна ў тым перакананьні, што калі справай пашырэньня часапісу зацікавяцца **самі чытачы**, дык будучыня часапісу будзе пэўная: **часапіс будзе большы і будзе часьцей выходзіць.** На падставе дагэтуляшняй выдавецкай практыкі і адбытых нарадаў рэдакцыйных супрацоўнікаў, можам ужо сяньня сказаць яшчэ больш. Калі сапраўды хочам мець добры фахова-гаспадарскі часапіс, дык дарога да яго адна: мусіць наступіць прадуманы да канца падзел працы. Найлепш рэдагаваны часапіс не дасягне сваё мэты, калі ня будзе мець добра сарганізаванага апарату адміністрацыйнага, гэта знача, калі часапіс ня будзе арганізавана пашыраца ад сяла да сяла, ад хаты да хаты, ад чалавека да чалавека. Гэтай **справай пашырэньня часапісу мусяць заняцца самі чытачы**, паводле пляну выпрацаванага ў адміністрацыі. Сама рэдакцыя гэтай работы зрабіць ніяк ня здолее, бо гэта перавышаць будзе ейныя і так праз меру перацяжаныя сілы.

Кідаем сяньня гэтыя думкі на дальшую развагу нашых Паважаных Чытачоў, просім абдумаць іх у сваім кругу і сваіх варунках і паведаміць нас аб сваім паглядзе на справу. Гэта нам канешна трэба ведаць пры састаўленьні пляну працы, як рэдакцыйнай, так і адміністрацыйнай. Асабліва важна нам ведаць гэткія пункты:

1. Ці дагэтуляшні кірунак часапісу кооператыўна-гаспадарскі добры і калі не, то чым яго трэба было-б дапоўніць?

2. Што з дагэтуляшняй „Самапомачы“ трэба было-б выпусціць і што завесьці?

3. Хто ў Вашай ваколіцы найпільней чытае „Самапомач“ — старшыя гаспадары, гаспадыні, моладзь, земляробы, рамесьнікі?

4. Найлепш было-б пашырыць часапіс як што да абыйма (замест 8 бачын даць 16), так і што да частасьці выхаду (замест месячніка — двутыднёвік); але што зрабіць у першую чаргу, калі пашырэньне ў абодвых кірунках за раз аказалася-б немагчымым з прычын матарыяльных?

5. Ці часапіс канешна мае называцца надалей „Самапомач“, ці яго трэба зьмяніць?

---

nim jubilejnym Źjeździe Sajuzu u červieni m-cy zaćvierdžany byŭ tryhadovy plan pracy u spažyvieckich kooperatyvach ŭ Polščy, jaki maje na ŭviecie: 1. pavialičeńnie liku siabroŭ u kooperatyvach, 2. pavialičeńnie ŭłasnych fondaŭ, 3. pavialičeńnie abarotaŭ tavarnych i razšyreńnie asortymentu (padboru tavaraŭ) u kooperatyŭnych kramach, 4. razbudova sobskich fabryk, 5. pavialičeńnie ličby kooperatyŭnych kramaŭ i davučvańnie kramnickich pracaŭnikoŭ.

---

za ich tolki kuplać tavary dy apłačyvać usiakija asabistyja ŭsłuhi i ŭsiakija zabaviazańni z hetaha tytułu. Zatoje nia možna było-b imi spłačyvać staryja daŭhi i nia možna było-b za ich kuplać zahraničnyja devizy. Z druhoha boku, kab zabiaśpiečyć hetym bonam vartaść rynkovuju nia mienšuju za hrošy normalnyja, treba vartaść ichniuju ahraničyć karotkim srokam (časam važnaści), pa jakim jany musiać być zamienieny na hrošy normalnyja. Hetki srok moh-by być 3 ci 6 miesiačny ad času vydrukavańnia hetych bonaŭ. Pa hetym časie bony vymieńvalisia-b va ŭsich kasach na hrošy sapraŭdnyja.. Dziaržava, naturalna, vykupiŭšy peŭnuju kolkaść bonaŭ, mahła-b vydavać bony novyja.

Treciaj spravaj, jakaja ablehčyła-b kursavańnie hetych bonaŭ, byŭ-by varunak, što zabaviazańni hetych bonaŭ mieli-b piaršynstvo pry ekzekucyi pierad zabaviazańniami ŭ valucie zvyčajnaj. Znača hetyja bony mieli b charaktar čysta abarotny na biahučyja vydatki: najpierš treba było-b spłačyvać biahučyja zabaviazańni, a paśla zabaviazańni ŭ valucie zvyčajnaj.

Dziaržava musiła-b u hetym banku, jaki vydaje tavarnyja bony, uziać sabie pazyčku, katoruju vypłačvała b nadvyžku pensyi svaim čynoŭnikam i słužbie i katoruju spłačyvała-b stupianiova paśla troch hadavoha sroku zvyčajnaj valutaj.

Heta, naturalna, źviazana z całaściu planu pierabudovy. Ličačysia z tym, što pry vykanańni jaho hramadzki dachod šyrokich masaŭ padyjmiecca, a tym samym pavialičacca j dachody dziaržavy, — dziaržava mahła-b stupianiova spłačyvać pazyku svaju ŭ banku, ab jakim była mova vyžej. Cieraz 10—15 hadoŭ bony svajo zadańnie vykanali-b i bank, jaki ich vydavaŭ, moh by być raźviazany.

Varunkam vykanańnia hetaha planu pierabudovy ładu jość: viera nasielnictva ŭ pravametnaść takoj pierabudovy i davier taho-ž nasielnictva da čyńnikaŭ, jakija hetki plan mieli-b pravodzić u žyćcio.

Павышэньне цэнаў на збожжа.

Ад больш як месяца часу, мы назіраем цікавае зьявіча — цэны на збожжа падыймаюцца. Каб лепш зразумець прычыну гэтага скоку цэн угару, глянем на яго з пункту гледжаньня чыста гаспадарчага, памінаючы палітычныя, ці нейкія іншыя.

Асноўным земляробскім прадуктам, які кіруе цэнамі іншага збожжа, ёсьць пшаніца. Гэта для нас можа ёсьць трохі дзіўным, бо ў нас пшаніцы вельмі мала сеюць. Але фактам ёсьць тое, што прычыны падаражэньня збожжа ляжаць далёка па за межамі нашага краю.

У мінулыя гады цэны на збожжа былі нізкія, бо запасы галоўнага збажжавога прадукту — пшаніцы былі вялікія. Нямецкі гаспадарскі часапіс — „Wirtschaft und Statistik“ падае наступныя цыфры. На дзень 1-шага жніўня сёлета ў галоўных пшанічных краёх, як: Злучаныя Штаты Паўночнай Амэрыкі, Канада, Аргентына, Аўстралія і іншыя, у тым ліку эўрапэйскія (Румынія, Югаславія і т. д.) было ў запасе 101 мільёнаў квінталяў.*) Каб усьведаміць сабе, што гэтая колькасьць для сьвету ня ёсьць вялікая, скажам, што тры гады таму назад, у 1933 г. пшаніцы было амаль два разы больш, прыблізна каля 210 мільёнаў квінталяў. Ад 1933 году запас пшаніцы штораз меншае: 1933 г. каля 210 м. квінталяў, 1934 год—каля 200 м. квінт., 1935 год—ужо толькі каля 140 м. квінт. 1936 год — 105 міл. квінт. Як бачым, запасы пшаніцы штогод меншаюць. А тымчасам, пачынаючы ад 1933 году — ураджай пшаніцы таксама штораз меншае — так што пшаніцы ўжо не хапае на пакрыцьцё попыту.

Сёлетнія ўраджаі слабаватыя і дагэтуляшнія запасы йшчэ зьменшаюць. У Эўропе прадбачыцца ураджай на 408 мільёнаў квінталяў, або на 20 мільёнаў квінталяў (q)менш, чымся летась. Неўраджай сёлета перадусім у Італіі і Францыі. У Амэрыцы ўраджай аблічаецца на 172 міл. квінталяў; гэта ёсьць крыху больш, чымсь летась і пазалетась — але менш — чым выпадае сярэдне за гады 1929-32, калі радзіла там-жа сярэдне каля 213 міл. квінт. Так што за гэты год амэрыканцы зьядуць свой запас, які раўняецца 47 міл. квінт. і ў іх яшчэ ня хопіць пшаніцы. А тыя гады Амэрыка шмат збожжа давала за граніцу.

У Канадзе (жытніцы сьвету) ураджаі вельмі слабыя. Усяго 54 мільёны квінталяў, калі ў мінулыя гады сярэдне было 94 міль. квінт. Блізу палавіна. Кожны мае сёлета найніжэйшы ўраджай за ўсе мінулыя 20 гадоў.

Міжнародны Аграрны Інстытут у Рыме аблічае сярэдні ўраджай на абшары паўночнай паўкулі — без СССР і Кітаю — на 820 міл. квінт. Летась было 865 міл. квінт., а сярэдні ўраджай за гады 1929-33 —раўнаўся 892 міл. кв. На абшары паўдзённай паўкулі, дзе знаходзяцца Аўстралія і Аргентына, ураджаі лепшыя — але не такія вялікія, каб маглі выраўняць страту паўночнай паўкулі.

Вось-жа, кепскія ўраджаі пшаніцы і падыймаюць цэны яе ўгару—а за гэтым ідуць і іншыя збажжовыя расьліны. Судзячы з гэтага ўсяго — цяперашняе павышэньне цэнаў на хлебныя расьліны ня ёсьць хвілёвым ці штучным, а выплывае зусім натуральна, што суліць яму даўжэй утрымацца на паверхні жыцьця.

П. З.

*) Квінталь мае 100 кілёграмаў, або 6 пудоў і 10 фунтаў.

А калі так, дык які прапануеце назоў, каб ён найлепш выражаў зьмест часапісу і імкненьне паступовага беларускага земляробагаспадара?

6. Як у Вас стаіць дагэтуль справа даручаньня „Самапомачы“ з пошты: ці хто ў гэтым не перашкаджае?

7. Якімі літарамі — гражданкай ці лацінкай — найахватней у Вас чытаюць і як па-Вашаму трэба было-б гэту справу наладзіць у нашым часапісе, каб яго маглі чытаць і карыстаць найбольш людзей?

8. Калі-б выдавецтву ўдалося здабыцца на прэміі для сваіх падпішчыкаў, дык што найлепш было-б у такую прэмію даць: кніжкі (якія), прылады: земляробскія, гадаўляна-вэтэрынарныя, садоўніцкія, агародніцкія, пчалярскія, дамова-гаспадарскія, гаспадарскарамесьніцкія і г. д.?

9. На колькі чалавек падпішчыкаў можна рахаваць у Вашай ваколіцы, калі і далей стасаваць падпіску групавую (па дзесяць на адзін адрэс)? і што трэба было-б зрабіць, каб зацікавіць людзей нашым часапісам і гаспадарскай літаратурай наагул?

У апрацаваньні адказаў на гэтыя пытаньні просім усіх прыняць дзейнае ўчасьце і дзеля кароткага часу і дабра справы — прысылаць адказы ў нашу рэдакцыю **як можна хутчэй.** На падставе гэтых адказаў і наагул радаў з мясцоў павінен быць апрацаваны і ў пару абвешчаны плян выдавецкай працы, каб у ім маглі ўзяць учасьце як найшырэйшыя кругі нашага грамадзянства. Ад гэтага залежа будучыня часапісу. Просім, спадзяёмся і чакаем!

РЭДАКЦЫЯ.

Вада як лек жывёлы.

(Канец).

Прыпаркі робяць у тых выпадках, калі ў адным месцы патрэбна сільнае вогкае цяпло, напр. на крыжы, на сьцягне, на сьцюдзёных набракненьнях, на гузах (на скулах), на застарэлых наростах (напр. пры шпаце), каб выклікаць вострае запаленьне, якое лягчэй вылячыць, чымся запаленьне застарэлае. Прыпаркі вельмі памоцныя пры параліжы каровы пасьля ацяленьня. Тут прыпарку прыгатаўляем гэтак: намочаная і выкручаная посьцелка складаецца ў колькі разоў, прыкладаецца ўздоўж хрыбта і крыжа і прасуецца жалезкам стала кантралюючы рукой (каб ня спарыць). Прыпаркі памагаюць таксама пры аслабленьню крыжа, прастрэле і зьвіхненьнях.

Награваньне парай і ўдыханьне пары (ігналяцыя). Лячэбнае дзеяньне пары можа абхапіць большую часьць цела, а то й такія мясцы, куды ані кампрэсам, ані прыпаркаю ня можна дасягнуць. Награваньне робіцца або з самай вадзяной пары, або з запаранага пахучага зельля, сьцёртага сена й канюшыны, сушанага чабору, румянку. Гэтае зельле мае ў сабе лячэбныя алеікі. Пару найлепш прыгатаўляць гэткім спосабам: менш як да паловы вядра наліваецца вада, у якую кідаецца разагрэты камень, каторы падтрымлівае кіпеньне. У гэты час усыпаецца ў вядро жменя зёлак, і пакуль не падставіцца пад жывёлу, прыкрываецца мяшком ці рэшатам, каб забясьпечыць ад апараньня. Гэткае награваньне парай памагае пры прастрэле крыжа, ад раматузу, параліжу, затрыманьня мачы і запаленьня нырак, аслабленьня крыжовых косьцяў, пухліны на падбрушшы, затрыманьня, набракненьня падгорля, прыпрутня і інш.

Удыханьне (інгаляцыя) пары прыгатаўляецца падобна як вышэй, дадаючы да варатку апрача зёлак яшчэ 1 лыжку тэрпэнтыны (ськіпідару), або крэоліны ці плыўкага дзёгцю. Гэткая пара памагае на скулы (катар) у насе, пры запаленьні падгарлянкі (мумпс), дыхальнага горла, пры цяжкіх золзах і хранічным запаленьні лёгкіх скаціны і авечак. Перад дзеяньнем пары трэба засланіць чымнебудзь вочы жывёлы і дапускаць пару павольна й не загарачую. Найлепей удыханьне стасаваць нанач, каб не прастудзіць. У птушак такія ўдыханьні памагаюць ад дэфтырыту і ад катару наса.

Як і калі прыгатаўляць катаплязмы і гарчычнікі (сінапізмы)? Катаплязмы дзеюць інакш за абклады, бо кампрэсы ўтрымоўваюць лагоднае цяпло доўга й глыбака. Прыгатоўваюць іх із паранай трасянкі сена, або ячменнай мякіны, макухаў, пшонных круп, ляннога сяменьня.—Адно з вышэй названых разгатаваць на густую масу, намазаць густым слоем паміж дзьвюма ці больш ляннымі тканінамі, прылажыць шчыльна да хворага месца, абвязаць і трымаць 3—4 гадзіны. Спыняе гэта боль з сярэдзіны ўстрымлівае разганяе запаленьне. Памагаюць пры сьцюдзёных пухлінах, набракненьнях золзаў і мышкаў. У такіх выпадках пухліна мягчэе і разходзіцца зусім, або — як пры золзах — лопае і выдзяляе гной.

Гарчычнікі (сінопізмы) дзеюць вельмі востра. Прыгатаўляюць іх із сухой гарчычнай мукі, якую разводзяць у цёплай вадзе на рэдкае цеста; пасьля размазываюць тонкім слоем на шматку і шчыльна прыкладаюць на хворае месца. Каб гарчычнік ня быў за востры, трэба дадаць частку (траціну) сьцёртага на парашок караня „альтэю“, а з недахопу гэтага — звычайнай мукі. Можна такія гарчычнікі рабіць із таркаванага хрэну, або печанай цыбулі, якая памагае ад пухлін і пры золзах. Гарчычнікі памагаюць таксама пры ахвачываньні крыжа, звіхненьнях, запаленьні горла, зімных пухлінах пры падстрэлах, пры пасьлярадовых недамаганьнях кароў, ды пры раматузе. Трымаць гарчычнік не даўжэй як поўгадзіны. Пасьля хворае месца трэба выцерці і памазаць алеем, або нясоленым маслам.

„Сіль Г.“ **Др. М. Ст.**

Слоўца аб саджэньні саду.

Садзіць садовыя дрэўцы можна цэлы час, як яны ня маюць лісьця. Дазнаныя практыкі аднак кажуць, што дрэўца пасаджанае ўвосені расьце само, а пасаджанае вясной патрабуе дагляду.

Навачасная садоўніцкая навука шмат у чым зьмяніла дагэтуляшнія пагляды на справу. І так: само дрэўца бярэцца як наймаладзейшае, 2—3 гадовае. Яма пад пасадку такога дрэўца капаецца беспасярэдна прад пасадкай і яна не патрабуе быць асабліва шырокай і ніколі ня сьмее быць за глыбокай: дрэўца ня можа быць пасаджанае глыбей таго месца, па якое яно знаходзілася ў зямлі ў школцы. Дзеля гэтага пры пасадцы паступаюць гэтак:

Пачынаючы капаць яму, верхні пласт зямлі, як лепш угноены, адкладаем асобна, каб яго палажыць на карэньне. Калі ўжо яма гатовая, прыступаем да саджэньня, бяручы канешна сабе памоцніка. Парадак працы гэтакі:

Адзін з работнікаў насыпае ў яму крыху пульхнай зямлі да такой вышыні, каб дрэўца, калі яго паставіць каранямі на насыпаным у яме копчыку, — шыйкай*) сваей было роўна з берагамі ямы. Каб гэту меру дакладна утрымаць, другі работнік кладзе на цьвёрдыя берагі ямы, ўпоперак яе, якуюсь дошку ці кусок латы, і дрэўца трымае ў яме так высока, каб ягоная шыйка ніколі

*) Шыйка дрэва гэта тое месца, дзе карэньне граніччцца з пнём дрэва.

ня была ніжэй перакладзіны; хоць і можа быць яна вышэй такой перакладзіны, то аднак найлепш каб была роўна з ёю. Лішне доўгае карэньне пры гэтым трэба абрэзаць вострым нажом. З паўночнай стараны дрэўца пасьля гэтага ўбіваецца роўны калок і карэньне прысыпаецца пульхнай зямлёй сабранай з самага верху пры капаньні ямы. Калі адзін работнік гэтак прысыпае карэньне зямлёй, другі, трымаючы цэлы час дрэўца, лёгка ім устрасае, але не падыймае, каб карэньне ня скомкалася.

Калі ўжо яма ўся засыпана, трэба яе ўтаптаць, ня гэтулькі каля самага пня, колькі над канцамі карэньня. Бо вельмі важным ёсьць, каб карэньне як можна лепш зраслося з зямлёй. Дзеля гэтага, калі няма небясьпекі марозу, дык трэба засыпаючы яму, яе адначасна пакрысе паліваць вадой. Садзячы дрэўца ўвосені, увакруг яго робіцца з зямлі малы копчык, с якога ў першую вясну ўжо робіцца „талерка." Пры вясьнянай пасадцы такая „талерка" каля пня робіцца адразу.

Абсыпанае і ўтоптанае дрэўца трэба прывязаць на кала саламяным перавяслам, скручаным у форме васьмёркі (∞).

Што да вымогаў на глебу, дык увосені найлепш садзіць на глебах сушэйшых і сыпкіх, а вясной—на глебах мацнейшых. Ігруша не баіцца сухасьці і сонца патрабуе мець з паўдня. Яблыня баіцца суха, ня любіць вапны, жвіру і каменьня.

Дрэўца ад дрэўца ня можна гусьцей садзіць, як 10—12 мэтраў.

Урэшце што да вышыні пня будучага дрэва, дык найлепшыя знаўцы справы радзяць для нашых зямель сарты гэтак званыя поўпенныя, 120 см. ад зямлі да кароны.

В. Р.

Што рабіць з бульбай,
якую мароз хапіў яшчэ на полі.

Раньняя сёлетняя восень з першымі маразамі не ў адным месцы захапіла бульбу на полі. Скажам дзеля гэта колькі слоў аб тым, як гэткую бульбу скарыстаць.

Калі такая бульба пасьля прымаразкаў паляжыць яшчэ колькі дзён у зямлі, дык яна „адыйдзе" і ў ёй вернецца папярэдні натуральны смак і выгляд. Але калі такую бульбу на другі ці трэці дзень пасьля прымаразкаў выкапаць і злажыць у ямы, дык тады яна можа сапсавацца: такую хутка выбраную бульбу ня можна хаваць, а яе трэба чым-хутчэй так ці гэтак скарыстаць у гаспадарцы.

Там, дзе мароз прыхапіў на полі значную колькасьць бульбы, так што яе ня можна так скора скарміць ці йнакш выкарыстаць у гаспадарцы, там астаецца выхад адзін: такую бульбу „сілёсаваць", гэта знача марынаваць. Робіцца гэта так:

У сухім месцы капаецца яма на паўтара мэтра глыбокая і гэтулькі сама шырокая, а ўдаўжыню бярэцца гэтулькі, колькі ёсьць бульбы да „сілёсаваньня". На спод такой ямы сыплецца сечка і мякіна пластам да 30 см. і на гэта сыплецца бульба, якая шчыльна ўбіваецца, асабліва ў кутках. Дзеля гэтага бульбу такую дробяць секачом. Добра таксама пасыпаць убіваную бульбу быдлячай сольлю, мяркуючы 50—75 грамаў гэтай солі на 100 кілё бульбы. Бульба гэтак насыпаецца ўціснена́мі пластамі ня грубейшымі за 30 см, на які пасьля сыплецца пласт сечкі грубіні 3 см, каб упіваў у сябе бульбяны сок. На сам верх сыплецца звычайны пласт сечкі ў 3 см грубіні, а на яе даецца пласт зямлі ў 60—75 см.

Гэтак прыгатаваную бульбу вельмі ахвотна есьць скаціна. Каровам дойным ня можна даваць на дзень больш як 8—10 кілё такой бульбы на дзень. Большая порцыя такой бульбы кепска адбіваецца на якасьці малака. Маладняку сілёсаванай бульбы сусім ня трэба даваць. *„G. R." № 42.*

Лянная выстаўка ў Абарку.

Дня 11 г. м. ў Абарку, Маладэчанскага пав. была наладжана выстаўка лянных і ваўняных вырабаў з найбліжэйшых ваколіц. Прадстаўлены былі ў вялікім ліку: палотны, ручнікі, настольнікі, дываны, гатовыя сьвіткі і наагул вопратка, а так-жа сэрвэткі, блюзкі, свэтры і цэлыя сукенкі. Шмат таксама было вырабаў з воўны, як дываноў, андаракаў, рукавіц, а наўперад шэрыя сьвіткі лемаваныя чорным аксамітам, каптуры і нагавіцы. Пры гэтай аказіі сабрана было на паказ шмат добра вычэсанага лёну, а акрамя таго — розная наша старасьвецкая гаспадарская снасьць. Не абыйшлося пры гэтым і бяз слаўнай беларускай Лявоніхі, выкананай пад гукі цымбалаў, гармоніка і скрыпкі. Выканальніцы гэтага і іншых стройных беларускіх танцаў былі апрануты ў шматкалёрныя „старасьвецкія" ўборы вясковых жанок, з пёстрымі істужкамі, пацеркамі, „каптурамі" ды шытымі галёнам і пацеркамі гарсэтамі.

Пры сягоньняшн.х варунках ня лёгка дагадацца, што ініцыятыва гэткага паказу беларускай мінуўшчыны і сучаснасьці выйшла ад мясцовай абшарніцы п. В. Эйнаровічыхі, якая была й гаспадыняй усей імпрэзы. Ня будзем дзеля таго дзівіцца, што ўсё беларускае на гэтай выстаўцы, паводле польскіх газэт, называлася тут „мясцовым," „тутэйшым" ці „рэгіянальным."

Быў час, калі польскія абшарнікі ў нас не прызнавалі, што беларуская культура наагул існуе. Сяньня тыя-ж абшарнікі зразумелі ўжо, што нашаму народу родныя: лявоніха, андарак, сьвітка, „каптур" з касьнікамі. Пажывём, а напэўна дачакаемся, што ўсё гэта перастане называцца „рэгіянальным" ці „тутэйшым," а будзе называцца сапраўдным імем беларускім. Бо такім яго ёсьць!

PČALARSTVA

Prad zimavańniem pčoł.

U druhoj pałavinie kastryčnika možna skazać, što ŭ pčalniku ŭsie raboty pakonč nyja. Pčoły pačynajuć svaju doŭhuju zimoŭku. Ciapier u ciopły i pahodny dzień pazdymać treba ŭva ŭsich vulloch stol, nakryvajučy pčalinaje hniazdo adnej paduškaj. Prad hetym treba na vierchnija belački hniozdavych ramak nałažyc niekalki tonkich lištvaŭ, kab pčoły mahli pierachodzić z ramki na ramku.

Stol zdyjmajem dziela lepšaje ventylacyi hniazda. Pčaliny kłubok patrabuje i vydzialaje vadu ŭ formie pary, jakaja skraplałasia-b na stoli i kapała-b na pčoły. Pry nižejšaj temperatury ściakajučaja vada vielmi škodnaja: raz, što jošć pryčynaju syraści i chvarobaŭ niastraŭnaści, nozemy, druhi, — mokrym pčołam duža zimniej, a navat mohuć źmiernuć u kryhu lodu. Usio heta pakazvaje, što kali chto nia źniaŭ jašče stoli ŭ vulloch, dyk niachaj nieadkładna jaje zdyjmie. Nałožanuju padušku treba ščylna apakavać pakullem. Vulli tonkaściennyja lepš za ŭsio akrucić sałamianymi matami znizu i bakoŭ. Možna tak-ža, jak heta robiać u Savietach, dva, try abo čatyry vulli stavić u adnu supolnuju skryniu, atulajučy jaje ciopłym matarjałam, napr. liściom, sienam i h d.

Kali-b chto mieŭ specyjalny budynak praznačany na zimoŭku pčoł, h. zv. zimavik (vuloŭnia), možna pa pieršych prymarazkach unieści tudy vulli, staŭlajučy radami, łotkami da siaredziny. U zimaviku nia treba atulać i specyjalna aciaplać vulloŭ, pamiatajučy ab tym, što vysokaja temperatura ŭnutry vulla bolš škodzić pčołam, čym ściuža.

Zabiaśpiečyć tolki treba hetki zimavik ad šołachu, śviatła i myšaŭ, jakija biespakojać a navat nistožać całyja hniozdy. Kata adnak u zimavik puščać nia možna.

Baraćbu z myšami i pacami viaści treba zaŭziatuju sposabami chimičnymi, padajučy aršenik, cyjanak i inš. Taksama i ŭ pčalniku, aciaplajučy vulli sałomaju, liściem abo matami, treba hladzieć, kab atulajučy mataryjał nie lažaŭ na ziamli. Tut vielmi časta źbirajucca polnyja myšy.

Jašče na adno źviarnu ŭvahu. Pčoły i zimoju kantralujuć svabodu łotki. I kali ščvierdziać jakuju-niebudź pieraškodu, dyk pačnuć nieadkładna z joj zmahacca. U henym zmahańni hinuć sotni pčoł ad ściužy dy svaimi trupami zatykajuć łotku. Tamu łotku možna źmienšyć, abo zbolšyć, u zaležnaści ad vonkavaje temperatury, ale nikoli nia možna jaje začyniać kratkami, ci sietkami.

Aprača vonkavaha dahladu pčoł, bortnik pavinien asablivuju ŭvahu źviarnuć na stan zimovych zapasaŭ. Pakul ciopłaja pahoda tryvaje, jašče možna pravodzić padkormku cukram (1:1), z damieškaj jakoha-niebudź kvasu (napr. salicylovaha). Padkormku padavać ciapier možna tolki zhary i ŭ ciopłaatulenaj sudzinie. Temperatura padadzienaje ježy pavinna być 15°C i pa mahčymaści ŭtrymana da poŭnaha spažycia. Hetkija siem'i nahladać treba praz całuju zimu, a asabliva rańniaj viasnoju, kab z niedachopu zapasaŭ nia spyniłasia dziejnaść roju, što moža adbicca na budučym sezonie.

Vučemasia na svaich-ža abmyłkach!

Minuły sioletni sezon byŭ uradžajny i miascami daŭ ad 10 hadoŭ nienatavany zbor miodu. U svajej sioletniaj praktycy ŭ Horadzienskim paviecie ŭdałosia mnie asiahnuć rekordovuju kolkaść sabranaha miodu z adnaho vulla. **Vulej Dadana Blatta № 7 daŭ u ahulnym vyniku 103 klhr. miodu:** pašytych 5 nadstavak pa 20 klhr. i adnu ramku hniazdavuju ŭ vazie 3 klhr. Jasna, što da suśvietnaha rekordu jašče daloka (saviecki pčalar Arciomaŭ, zahadčyk 5 kałhasu „Pčeła“, Krasnajarski Kraj, pastaviŭ rekord 300 klhr. miodu z adnaho vulla!), ale na našuju biednuju biełaruskuju floru (miadadajnyja raśliny) i heta jošć vialikaj zdabyčaj. Inšyja vulli ŭ našym pčalniku dali siarednie ad 60 da 75 klhr. Cikavaja reč, što vulej O. Čynki, tak reklamavany ŭ polskaj pčalarskaj litaratury, sioleta ŭ našym pčalniku nie zdavoliŭ našych natuhaŭ i nia tolki nia daŭ reklamavanaje cyfry 150 klhr., ale navat i pałaviny hetaha (tolki 65 klhr.).

U čym-ža lažyć tajnica našaha rekordu 103 klhr.? Reč prostaja: **u ahramadnaj sile rabočaj muchi i poŭnym raźvićciu siamji prad poŭnym miodazboram.**

Užo 28 červienia siła pnia była tak vialikaja, što pčoły, pamima nastaŭlenaje nadstaŭki, „boradami“ načavali pad vullom. Tady była pastaŭlena druhaja, pryhatavanaja nadstaŭka, z poŭnym kampletam ramak. Pčoły zaraz-ža pierajšli i prystupili da pracy. U dziesiać dzion užo byli hatovyja dźvie nadstaŭki. U hetym časie inšyja „susiedzi“ „zmahli“ pałažyć tolki pa adnej nadstaŭcy. U tydzień pa pieršaj vykrutcy byli hatovyja dźvie nastupnyja nadstaŭki, a ŭ dziesiać dzion—apošnija. Pry hetym treba zaciemić, što kolkaść miodu ŭ hniaździe była zdavalniajučaja, a navat na zimu vyniata adna ramka.

Čamu inšyja pni astalisia ŭ henym „razhonie“ praduktyŭnaje pracy daloka zzadu? Vina lažyć, reč jasnaja, nie na pčołach, ale na mnie. Prosta kažučy, nia było rezervovych kampletnych nadstavak, kab vykarystać „biezrabоćcie“ pčoł u časie haloŭnaha ŭziatku, kali kantrolny vulej pakazyvaŭ dziennuju prybyl 5 klhr. miodu!

Z hetaha jdzie takaja navuka na budučyniu: prystupajučy da pradukcyi miodu treba **mieć nia mienš jak dźvie nadstaŭki z nałaďžanym voskam** dy ŭ adpaviednym časie ich nadstavić. Da hetaha adnak treba ad **samaje**

vosieni natužyć usie siły i ŭvahu, kab pčoły dobra pierazimavali, kab mieli zdavalniajučuju kolkaść miodu i piarhi rańniaju viasnoju i kab dziejnaść matki i całaj siamji mieła poŭnuju svabodu raźvićcia, asiahvajučy svaju najbolšuju siłu na dva tydni pierad hałoŭnym uziatkom. Adkidajučy ŭsiaku ju spekulacyju čałaviečaha sprytu, jak ahraničeńnie i zabojstvy matki, zaharadki i h. d., pastupovy bortnik pavinien **išci pa linii naturalnaha žyćcia pčoł i vykarystać pryrodnyja siły mnohatysiačnaje armji pracoŭnaje žyviny — voś sapraŭdny šlach da postupu ŭ pracy siańniašniaha bortnika.**

Iduć doŭhija, šeryja viečary vasieńnija i zimovyja. Pracy ŭ pčalniku amal što niama. Treba vykarystać hety čas na poŭny pierahlad našaje pracy, treba pačać vyvučeńnie pčalarskaj viedy. Chaj pčalarskaja kniha budzie nieadłučnym našym pryjacielam. **Biełarus, jak pčalar, pavinien asiahnuć uzrovień suśvietnaje slavy.** **V. Papucevič.**

ГАСПАДАРСКАЯ ХРОНІКА

Маюцца дрэнажаваць грунты ў Браслаўшчыне й Дзісеншчыне. Браслаўшчына й Дзісеншчына, хоць і маюць мясцамі добрыя грунты, то аднак неўраджаі ў гэтых як-раз мясцох здараюцца вельмі часта. Найважнейшай прычынай гэтых неўраджаяў ёсьць неўрэгуляваньне вогкасьці (вільгаці) ў тамашніх *моцных* грунтох. Гэта маючы на ўвазе Віленская Земляробская Палата, на сваім паседжаньні 17 г. м., між іншым пастанавіла ў працягу сёлетняй яшчэ зімы апрацаваць плян здрэнажаваньня (асушэньня) пэ 100 га глебы ў кожным з вышменаваных паветаў. У наступных гадох гэткую працу весьці маюць далей, у залежнасьці ад заінтэрасаваньня ёю мясцовага насельніцтва. У першую чаргу будуць дрэнажавацца тыя грунты, якія найчасьцей церпяць ад надбытку вільгаці: перш размакаюць, а пасьля ссыхаюць на камень.

Праектаваньне дрэнажу і тэхнічны дагляд за работамі будуць для ўласьнікаў грунтоў бясплатны. Уласьнікі грунтоў павінны толькі даць работніка і матар'ял (дрэнажныя трубкі інш.). Пры выбары гаспадарак дзеля такога дрэнажаваньня пяршынство маюць мець гаспадаркі скомасаваныя.

Зьбіраньне і экспорт лекарскіх зёлак. У Баранавічах анагдай паўстала сумысная пляцоўка дзеля зьбіраньня і вывазу заграніцу лекарскіх зёлак. Першы транспорт такіх зёлак у Нямеччыну ўжо адпраўлены. Ёсьць заказы на транспорты дальшыя.

Аплата за агляд мяса і жывёлы празначанай на забіцьцё на Віленскай бойні мае быць абніжана на 15 - 20 проц.

Гадаўляная выстаўка. Дня 26, 27 і 29 г. м. ў Опсе, Плюсах і Мёрах (Браслаўшчына) арганізавалася выстаўка бугаёў чырвонай расы. Як ведама, „чырвоная польская" раса скаціны сільна была прапагавана і ўспамагана ў нас ад самага пачатку, калі прыйшлі ў наш Край палякі. З часам аднак жыцьцё паказала, што штучна накідываны кірунак у гадоўлі аказаўся няўдачным і дзеля таго найвыдатнейшыя мясцовыя гадаўцы скаціны заснавалі год з лішнім таму назад Т-ва дзеля гадоўлі скаціны „паўночнай," знача мясцовай. Аб рэзультатах працы гэтага Т-ва тымчасам неяк ня чуваць. Затое вось прыхільнікі „чырвона-польскай" скаціны, як відаць з весткі аб выстаўцы, здавацца ня думаюць і нават прабуюцьісьці наперад.

Грошы танеюць 26 верасьня сёл. Францыя, у паразуменьні з Амэрыкай (Зл. Шт. П.А.) і Англіяй абніжыла вартасьць сваіх грошай на адну траціну. Адначасна абніжылі вартасьць сваіх грошаў:Швайцарыя,Галяндыя, Італія і Чэхаславаччына. Адпаведныя чыньнікі Польшчы й Нямеччыны заявілі, што гэтыя дзяржавы вартасьці сваіх грошаў абніжаць ня будуць. — Апошнім часам газэты пісалі, што Польшч выслала свайго прадстаўніка ў тыя дзяржавы, якія абніжылі вартасьць сваіх грошаў, каб на месцы абзнаёміцца, як гэта справа прадстаўляецца. Паваpоту гэтага прадстаўніка чакаюць яшчэ прад 1.XI.1936 г.

Парцэлююць, але ня ў нас. Распараджэньнем Міністэрскай Рады з дня 28 верасьня сёл. загадана парцэляцыя 109 двароў (маёнткаў) у Польшчы, з агульнай плошчай 27.000 гэктараў. Характэрна, што ў сьпісе гэтых двароў няма аніводнага на тых абшарах, дзе жывуць беларусы: ваяводзтвы Віленскае, Навагрудзкае, Беластоцкае, Палескае. На гэтых абшарах двароў не чапаюць.—Малая аднак мусіць была-б радасьць для беларускага селяніна і з „парцэляцыі," бо яна йдзе сягоньня ў пары з насаджваньнем чужых нацыянальна асаднікаў і каляністаў. Доказам гэтага ёсьць пратэстацыйная акцыя ўсх. — галіцкіх украінцаў, пачатая 15 г. м. проціў насаджваньня пад відам парцэляцыі новых і новых чужых асаднікаў.

На прырэзку — гэктар, асаднікам — два. Газэты паведамляюць, што на абшары Ашмянскага павету ад 1925 г. урадава было распарцэлявана пяць з паловай тысяч гэктараў зямлі. З гэтага толькі дзьве тысячы гэктараў, пайшло на прырэзку для гаспадарак мясцовых (беларускіх і небеларускіх), а рэш-

Redaktar inž. A. KLIMOVIČ Vydaviec A. DASIUKIEVIČ
Z upavažnieńnia Biełaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury ŭ Vilni.

Biełaruskaja Drukarnia im. Fr. Skaryny, Vilnia, Zavalnaja 1 — 2.

шта была аддана вайсковым асаднікам, чыноўніцкім каленіям. — Пры гэткай „рэформу“ беларускі сепянін дзякаваць ня мае што.

Замест жыдоў — пазнанякі. У Пазнані арганізаваўся „Związek Polski,“ які, паводле слоў ягонага ж сэкрэтара, мае арганізаваць наступ польскіх пазнанскіх купцоў на ўсю Польш, у тым ліку і „па Wilenszczyznę,“ каб усюды выпіраць з гандлю жыдоў і займаць іхняе месца. — Ці гэта справа пазнаняком удасца — трудна сказаць. Найхутчэй аднак, калі яны дойдуць да нашых беларускіх сёл і мястэчак, дык будзем мець і жыдоў і пазнанякоў разам. А ад гэтага нам лягчэй напэўна ня будзе. Дзеля таго трэба за гандаль у сябе брацца самым беларусам.

Пазыкі пад застаў збожжа. Як ужо пісалася ў „Самапомачы“, „Цэнтр. Каса Земл. Супалак“ („Centr. Kasa Spółek Rolniczych“) пачала выдаваць земляробам пазыкі пад застаў збожжа. Варункі такой пазыкі наступныя: 1. пазыку трэба вярнуць найпазьней да 31.V.1937. 2. Працэнт ад пазыкі 3 зл. з соткі, ня лічачы коштаў канцэлярыйных і вэксалёў. 13. Пазыкі даюцца: за 100 клг. жыта або аўса — 7 зл., ячменю — 8 зл., пшаніцы — 10 зл., ляннога сяменьня — 20 зл., грачыхі і расьлін стручковых — 50 проц. (палова) цаны рыначнай. 4. Забясьпечваюцца пазыкі вэксалямі і сплачываюцца часткамі

Аб пераацэнцы грунтоў. На паседжаньні Віленскай Ваяводзкай Клясыфікацыйнай Камісіі, дня 3.X.1936 г. быў зроблены пераглад працы ад пачатку (5.IX.1935 г.) да 1.IX. 1936 г. Да гэтага часу пераацэнена было ўсяго 33.980 гэктараў грунту. Да ацэнкі было прадстаўлена 18 гатункаў глебы. Пры гэтым пастаноўлена было зарахаваць дзісенскія наплаўныя гліны і гляі ў 3-ю катэгорыю, а змэліораваныя тарфянішчы — да 5-й катэгорыі. Працы ацэншчыкаў грунтоў ідуць далей і на іх трэба зьвярнуць пільную ўвагу, каб не ацэнькалі нашых грунтоў вышэй тэй нормы, на якую яны сапраўды заслугоўваюць.

Скупліваньне трапанага лёну ў м-цы лістападзе будзе адбывацца паводле наступнага парадку: Празарокі—2 лістапада, Вільня — 3, Гарадок каля Мал. —3, Іўе—4, Браслаў‘е —4, Ашмяна—5, Опса—9, Мір—9, Відзы—10, Стоўпцы—10, Мёры—12, Гэрманавічы (выстаўка бяз скупу)—15, Гадуцішкі — 19, Дзярэчын—23, Порплішча—23, Парфенава 24—25, Слонім—26, Паставы —30 і Дунілавічы — 1.XII.

Канфіската „Беларускага Адрыўнога Календара на 1937 г. Адміністрацыйныя ўлады сканфіскавалі 23 г. м. цэлы наклад „Бел. Адрыўнога Календара на 1937 г.“ (30 тысяч), які на супалку выдавалі тры Віленскія беларускія кнігарні. Ёсьць гэта для беларусаў вельмі вялікая страта. Справу гэтай канфіскаты мае аканчальна вырашыць у прысьпешаным тэмпе Віленскі Гарадзкі Суд, бо справа прызнана тэрміновай. Дзеля гэтага кожны беларус павінен устрымацца ад куплі чужога календара і чакаць свайго, беларускага.

Не пакідайце на зіму незаараных грунтоў, асабліва грунтоў мацнейшых.

Глыбокай воркі на зіму патрабуюць наўперад усе навіны (дзірваны), а таксама грунты пад усякія акопніны, як буракі, бульба і іншыя.

Усячына.

Як пазбыцца кратоў з сенажаці. Краты, нішчачы розныя чарвякі ў зямлі, прыносяць гаспадару вялікую прыслугу. Але часамі бываюць яны і шкоднымі, асабліва на сенажаці. Каб прагнаць крата з сенажаці, ёсьць некалькі спосабаў. Падаём тут толькі два. Добрым спосабам ёсьць укладаньне ў норы кратоў анучаў, або пакулаў намочаных у карасіне. Яшчэ лепшым і танейшым спосабам—ёсьць укладаньне ў норы адпадкаў ад селядца, як галовы, хвасты, косткі хрыбта. Гэтыя спосабы ёсьць тым добрыя, што яны ня нішчаць крата, а толькі праганяюць яго на другое месца, дзе ён можа быць вельмі карысным, як напрыклад у садзе.

Якой даўжыні павінна быць сечка. Чамусьці з даўных часоў па нашых сёлах завёўся звычай рэзаць дробную сечку і сяляне пераканаты, што чым драбнейшае сечка, тым яна лепшая. Да гэтага нават дастасаваныя сячкарні, ці лепш сказаць — сьлімакі сячкарняў. Буйнейшая сечка спад такой сячкарні раўняецца 1,8 см, драбнейшая—толькі 1 см.

Навейшая гаспадарчая літаратура цьвердзіць, што дробная сечка ёсьць шкадлівай для жывёлы, а асабліва для коняў. Гэта дзеля таго, што дробная сечка не заўсёды бывае добра перажавана і пападае цэлая ў жалудак, гдзе выклікае колькі Добрая нешкадлівая для здароў‘я жывёлы сечка павінна мець прынамся 2 см. даўжыні, не карацейшая, а даўжэйшая ніколі не пашкодзіць.

Як бараніць драўляныя слупы ад гніцьця. Найтанейшыя і добрыя на гэта будуць спосабы наступныя: Абліць зачасаны на 75 см. слуп ад споду карасінай і абпаліць. Другі спосаб: мачыць слуп у вадзе, дзе ёсьць распушчаны сіні камень (серчанік медзі $CuSO_4$). На 100 літраў вады распускаецца 5 кг. сіняга каменю і зачэсаныя слупы мочым у гэтым растворы у працягу трох дзён. Пасьля сушым і ўбіваем у зямлю.

Слуп павінен быць усаджаны у зямлю дагары камлём. Ніколі таксама ня можна заганяць слуп на месца старога слупа згніўшага.

Штучную воўну з малака выдумалі італьянцы летась і назвалі яе „Ляніталь.“ З пачаткам 1937 г. гэту самую воўну, толькі пад назовам „Поляна“ будуць вырабляць у Лодзі. Тымчасам штучная воўна будзе даражэйшая за воўну натуральную. На адно кілё штучнай воўны трэба 33 літры малака.

Новыя гаспадарскія міністэрствы ў Саветах. На моцы распараджэньня ВЦІК—СССР сарганізаваны пяць новых міністэрстваў з галіны гаспадаркі, пайменна: міністэрства лёгкага промыслу, спажывецкага промыслу, лясного промыслу, міністэрства саўгасаў (савецкіх гаспадарак) і міністэрства жывёлагадоўлі.

Pierasyłka apłačanu ryčałtam.